ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 ЛІПЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15773)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Milki: «Трэба верыць у свае сілы!»

**Група, у якой сёння спяваюць пяць чароўных дзяўчат — Марына Путнікава, Таццяна Стахоўская, Таісія Серыкава, Ганна Рай і Вікторыя Назарко, — была створана крыху больш як паўгода таму. Аляксандр Рыбак адбіраў удзельніц для гурта падчас кастынгаў па розных гарадах Беларусі. Так з'явіўся калектыў Milki. Першая спроба пакарыць «Еўрафэст» дзяўчатам не ўдалася. Але яны паставіліся да сваёй няўдачы спакойна: кажуць, значыць, будзем пакараць іншыя вяршыні. Мы сустрэліся з удзельнікамі гурта перад іх выступленнем у Віцебску, каб пазнаёміцца бліжэй.**



***— У вас ёсць міжнародны фан-сайт. Ці адсочваеце, якія водгукі пакідаюць прыхільнікі?***

**Таццяна:** Пішуць рознае, але каментарыі і паведамленні пераважна станоўчыя. Нам прыемна, што людзі так нас прымаюць, нягледзячы на малады ўзрост калектыву. Няхай мы сфарміраваліся толькі перад «Еўрафэстам», але народ палюбіў нас за тое, што мы рабілі. І, нават калі мы не прайшлі, публіка не перастала нас падтрымліваць — значыць, ёсць да чаго імкнуцца і трэба рухацца наперад.

*Пасля адбору на «Еўрафэсце» ў дзяўчат быў творчы адпачынак. Але калектыў працягвае сваё сцэнічнае жыццё. Зараз дзяўчаты актыўна ездзяць на сумесныя канцэрты з Ларысай Грыбалёвай і Сашам Нэма. У найбліжэйшай перспектыве — запіс кліпа на любімую ўжо многімі песню «Акцэнт».*

*Дарэчы, дзяўчаты не толькі спяваюць у гурце, але і рэалізуюць сябе ў розных іншых сферах. Марына працуе выкладчыцай харавой дысцыпліны ў сваім горадзе, Таісія выкладае вакал дарослым, Ганна працягвае вучобу ва Універсітэце культуры, а Таццяна гастраліруе з заслужаным ансамблем Беларусі «Цярніца», маючы магчымасць і спяваць, і вандраваць.*

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Галопам да перамог

# БЫЦЬ У СЯДЛЕ!

## Коні вучаць гэтаму не толькі ў спорце

**Навошта дзеці носяць з сабой у лагер цукар, пра што лепш не ведаць іх бацькам і як навучыцца кіраваць пяццю цэнтнерамі жывой вагі, высвятлялі карэспандэнты «Чырвонкі», якія наведалі спартыўна-аздараўленчы лагер дзённага знаходжання для навучэнцаў Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі.**

### ХАРЫЗМА ВЫХАВАНКІ ДАШЫ

— Не бойцеся вы яго так, — паказваючы на каня, звяртаецца да мяне выхаванка цэнтра Даша Бронская. — Гэта Харызма. Яна вельмі любіць цукар і яблыкі. Вось, — працягвае Даша пачастункі, — пакарміце свайго новага сябра.

Сябрамі, як мне падалося, з Харызмай мы так і не сталі. Кабыла з маёй рукі ўсё, вядома, з'ела, але пасля зноў павярнулася да Дашы.

— Харызма адчувае, што вы яе трохі баіцеся, — быццам апраўдваецца дзяўчына. — Я ўвогуле да гэтага каня тры месяцы падыход шукала. Тут не ўсё так проста. Спачатку жывёла да цябе прывыкае, потым правярае і толькі пасля дазваляе вершніку стаць у «дуэце» галоўным.

Юная спартсменка прызнаецца, што не заўсёды расказвае пра падобныя «прыгоды», калі конь шкодначае, бацькам.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Даша Бронская і Харызма спяшаюцца на ранішнюю трэніроўку.

Фота Надзеі БУЖАН.

«Горадаўтваральная» адукацыя

# ПА РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ — У... ГІМНАЗІЮ

## Маладыя шведы лічаць, што вучыцца ніколі не позна

**Атрымаць музычную адукацыю, вывучыцца на зваршчыка і фрэзероўшчыка, засвоіць прафесію цырульніка ці кухара шведскія старшакласнікі могуць у сценах адной навучальнай установы. Як гэта адбываецца, беларускія педагогі і журналісты змаглі ўбачыць на свае вочы, наведаўшы гімназію ў горадзе Оскарсхамн. Гімназічная адукацыя ў Швецыі — гэта старшая ступень школы. Яе праграма разлічана на тры гады. Дарэчы, гімназію ў Швецыі заканчваюць, па нашых мерках, даволі позна — у 18-19 гадоў. А вучняў гімназіі тут называюць... студэнтамі. Абавязковая адукацыя ў гэтай краіне — дзевяцігадовая, але ўсе разумеюць, што ў сучасным свеце як мінімум без сярэдняй адукацыі не абысціся, таму каля 95% падлеткаў не спыняюцца на дзевяці класах і ў залежнасці ад сваіх інтарэсаў і схільнасцяў выбіраюць для сябе ў гімназіі тую ці іншую праграму навучання. А выбіраць ёсць з чаго.**



Крысціна Ліндваль і Ёран Андэрсан:
«У Швецыі вельмі ганарацца сваёй музычнай адукацыяй...».

### КАДРЫ ДЛЯ СВАЙГО РЭГІЁНА

Гімназія горада Оскарсхамн сярэдняя па памерах. Яе наведваюць прыблізна 1 100 чалавек. Тут ёсць аддзяленне, дзе эмігранты могуць вывучаць шведскую мову. Ёсць спецыяльнае аддзяленне для дзяцей з асаблівасцямі разумовага развіцця. Тут жа могуць падцягнуць свае веды па тых ці іншых прадметах і дарослыя, якія ўжо выйшлі з гімназічнага ўзросту.

— Пакольki гімназія ў горадзе ўсяго адна, мы імкнёмся максімальна задаволіць усе адукацыйныя запыты, — расказвае яе дырэктар Ніклас Хамар. — Дарэчы, па колькасці супрацоўнікаў наша навучальная ўстанова — у пэўным сэнсе даволі буйное прадпрыемства ў горадзе.

У Швецыі няма аналагаў беларускай сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Затое якраз на старшай ступені школы ёсць магчымасць бліжэй пазнаёміцца, а магчыма, і звязаць свой далейшы лёс з той ці іншай прафесіяй. Оскарсхамн — партова-прамысловы горад. Непадалёку ад яго знаходзіцца атамная электрастанцыя. Таму педагогі лічаць сваёй задачай вырасціць новае пакаленне рабочых для транспартнай галіны, будаўніцтва і прамысловасці.

**Кіраўнік прамысловай праграмы Хелена ГРЭН** падкрэслівае, што ў аснову яе занятка́ў пакладзена рэалізацыя тых ці іншых канкрэтных праектаў, паколькі вельмі важна, каб вучні выраблялі рэчы, якія насамрэч будуць кімсьці запатрабаваныя.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***